


■ Нататнік Яго жонкі

**Святлана ДЗЯНІСАВА,**
**галоўны рэдактар часопіса «Маладосць»**

# УРОК МАЛАДЫМ ГАСПАДЫНЬКАМ



Гэты свет зусім не арыгінальны і мяняць сваю пазіцыю не збіраецца. Ніводнага намёку на тое, што заўтра сонца ўзыдзе з іншага боку або памяняе колер. Дождж нязменна падае зверху ўніз, грыбы растуць шапачкамі ўгору, птушкі ляцяць дзюбамі ўперад, падзеі адбываюцца тады, калі адбываюцца... І ўсе як адзін часопісы для жанчын прапануюць сваім чытачкам псіхалагічныя тэсты. Як быццам нам няма чым заняцца і нехта яшчэ не ведае, што вынік часопіснага тэсціравання залежыць ад каго і чаго заўгодна, толькі не ад асобы, якая адказвае на пытанні. Ад надвор'я — залежыць, дня тыдня — таксама, ад часу сутак — без ніякіх сумненняў. Ад фазы Месяца і пазіцыі Венеры, атмасфернага ціску і адлегласці да месца працы, кошту новай сукенкі і апетыту, гарачыні асфальту і адцення лістоты на дрэвах... Ад чаго і каго заўгодна, толькі, паўтару, не ад асобы, якая адказвае на пытанні. Дык навошта іх задаваць?

Вось новы адмысловы тэст пад назвай «Мыццё». Дадзена: цэлы кош бруднай бялізны. І нічога чыстага ва ўсёй хаце. І няма чаго больш надзець. Значыць, мыць трэба сёння. Але неба зацягнута хмарамі. Значыць, пойдзе дождж. Мыць бялізну быццам нельга, бо вывешваць яе давядзецца пад дождж. Ну, так ва ўмовах тэста сказана.) Што, спадарынькі, будзем рабіць? Вось варыянты адказаў: адкласці мыццё да заўтра (хоць надзець, заўважу, няма чаго ўжо сёння), чакаць і маліцца (у спадзяванні на праясненне), распачаць мыццё (не звяртаючы ўвагі ні на якія хмары), не верыць сваім вачам (бо прагноз быў зусім іншым).

Што б вы ні выбралі, пра вас усё даўно вядома складальніку тэста. Бо вы для яго і без тэсціравання як азіяцкая страказа: плоская празрыстая істота без намёку на існаванне. Я ў тым сэнсе, што ён вас не бачыць. Ва ўпор. Далібог, не бачыць! Калі вы раптам выбераце «адкласці да заўтра», то для складальніка тэста гэта будзе азначаць, што вы дазваляеце ўплываць на сваё жыццё кожнай дробязі, што нервы ў вас з-за гэтага, мякка кажучы, ніякія, і вам трэба не бялізну мыць, а ехаць тэрмінова ў адпачынак. Вось як!

Калі спыніцеся на варыянце «чакаць і маліцца», значыць, паводле часопіса, усім вы ў жыцці задаволены. Так задаволены, што якраз і не хапае вам парачкі няўдач. Няхай тады вы прычакаеце менавіта дождж, і каб намачыў ён вам бялізну, а заадно і галаву.

Калі, ні на што не зважаючы, вы распачняце мыццё, значыць, гатовы рабіць немагчымае. Але не таму, што такая вы аптымістка, а зусім наадварот: бо ўсё вас, як той казаў, «дастала», і вы ў адчаі імкняцеся ўсё памяняць, нават дождж ператварыць у сонца.

Ну а калі вачам сваім не паверыце — значыць, такія вашы вочы: ніколі не бачаць ніякіх падстаў для трывогі і неспакою.

У чым вы паедзеце на адпачынак сёння, адклаўшы мыццё на заўтра, — пра гэта не паведамляецца. Толькі сказана для кожнага, што пасля дажджу, якім бы ён ні быў працяглым, заўсёды бывае сонечна. Дык ці вы без тэста гэтага не ведалі?

Я, спадарынькі, вось пра што. Тэсты тэстамі, жарты жартамі, а мыццё бялізны — сваім парадкам, жаночае чытанне — сваім, сняданкі з вячэрамі — сваім. Спачатку мы гатуем ежу, потым мыем посуд, а не наадварот. Спачатку мыем посуд і бялізну, потым чытаем часопісы і адказваем на пытанні тэстаў. Іначай вас лёгка заблытае іх стваральнік.

■ Фікцыя, аднак...

# ШТАМП ЗА ГРОШЫ

**Днямі ад устрывожанай матулі даведалася, што Іна, мая сяброўка дзяцінства, выйшла замуж. Здаецца, чаго перажываць: і ўзрост падышоў, і, мабыць, знайшла свайго адзінага. Але маці ўсё не супакойвалася: «Няма там кахання. Адзін разлік і грошы. І як яны з гэтым жыць збіраюцца?» Уся справа ў тым, што шлюб фіктыўным аказаўся. Бабка нявесты прагаварылася.**



## ДЗЕЛЯ РАЗМЕРКАВАННЯ

Шчыра? Пра такі шлюб я і сама думала на чацвёртым курсе ўніверсітэта. І не адна я. Аднагрупніцы Алена і Віка таксама не хацелі чамаданы ў вёску на два гады збіраць. Размеркаванне — рэч такая, адразу пра ўсе маральныя прынцыпы забываеш. На шчасце, абышлося.

— У дэканаце сказалі, што камісія заяўку з прыватнай фірмы (працую там ужо другі год) хутчэй за ўсё не зацвердзіць. Мяняць працу мары на, як той казаў, вялікі вопыт у глыбінцы я не збіралася. Вось і прыйшлося пайсці на такія кардынальныя меры, — разгаварылася Іна.

Іна скончыла БДПУ імя М.Танка, факультэт спецыяльнай адукацыі (лагапедыя).

— Будучага фіктыўнага мужа я знайшла ў інтэрнэце. Вясной, напярэдадні размеркавання, такіх аб'яў там шмат. Напісала, можна сказаць, першаму сустрэчнаму. Характарыстыкам ён адпавядаў: мінчанін, з вышэйшай адукацыяй, ваенны. «Жаніху» Дзянісу тэрмінова былі патрэбны грошы, таму пытанне вырашылі хутка. Кошт штампа ў пашпарце — 850 долараў. Я не таргавалася: не было часу, — расказала мая сяброўка.

Дарэчы, сёння цэны на фіктыўныя шлюбы ў нас адны з самых нізкіх: ад 500 долараў. У Еўропе такая паслуга пачынаецца ад 3-5 тысяч долараў. Там фіктыўны шлюб з'яўляецца злачынствам, за якое можна пазбавіцца волі або заплаціць немаленькі штраф. Таму трэба яшчэ і «кошт рызыкі» ўлічваць.

— Не паверыш, але мы з Дзянісам пасябравалі. Нават два разы ў кіно хадзілі, — дзеліцца Іна. — Але нічога не падумай, у нас выключна дзелавыя адносіны, — працягвае яна.

Мяркуючы па гісторыях на форумах, не ўсім так шанцуе з «фіктыўнымі нарачонымі». Адны пачынаюць судзіцца за жыллё і маёмасць (як муж і жонка, зразумела), іншыя не могуць развесціся, таму што ён ці яна проста знікае. Каб хоць неяк падстрахавацца сябе, спрактыкаваныя жаніхі і нявесты раяць заключаць шлюбныя дагаворы.

## ДЗЕЛЯ ГРАМАДЗЯНСТВА

«Студэнту політэхнічнага ўніверсітэта патрэбны жонка і прапіска. Хачу застацца ў Беларусі. Пішыце, тэлефануйце». Такую аб'яву маладога азербайджанца я знайшла на прасторах інтэрнэту. За «паслугу» хлопец гатовы заплаціць 1,5 тысячы долараў.

Атрыманне грамадзянства — яшчэ адна распаўсюджаная прычына заключэння фіктыўных шлюбаў. Але тут не ўсё так проста. З 2010 года праваахоўныя органы атрымалі магчымасць праводзіць праверку інтэрнацыянальных шлюбаў. Раней від на жыхарства замежнікі атрымлівалі амаль адразу пасля вяселля, сёння трэба чакаць паўгода. Падазроным можа паказацца той факт, што «маладыя» не жывуць разам, не ведаюць дня нараджэння адно аднаго, блытаюцца, якога колеру шпалеры ў пакоі і колькі каму гадоў. Калі фіктыўнасць шлюбу пацвярджаецца, замежнік адпраўляецца на радзіму.

## ДЗЕЛЯ МІНСКАЙ ПРАПІСКІ

— Распісаліся з аднагрупнікам паўгода таму. Мне патрэбна была прапіска, яму не шкада было пашпарта, — пачула ад дзяўчыны па імені Марына на вяселлі ў сяброўкі. — Для кагосьці гэта глупства, сорам і г.д., для мяне — рашэнне пэўных праблем.

Марына прызнаецца, што бацькі жаніха ідэю не вельмі падтрымалі, але Ілья быў настроены рашуча. Плата за прапіску — дыпломны праект.

— Што я буду рабіць, калі сустрэну сапраўднае каханне? Кахаць! Замуж выходзіць! Штамп у пашпарце не прысуд! — упэўнена кажа дзяўчына. — Мая мама ўвогуле лічыць, што Ілья да мяне неабыякавы. Можа, і разводзіцца не прыйдзецца, — кажа яна.

## І ЯШЧЭ ВАРЫЯНТЫ

А вось тое, што фіктыўны шлюб можа быць патрэбен для таго, каб... уцерці сяброўкам нос, было сапраўдным адкрыццём.

«Цяжарнай патрабуецца фіктыўны шлюб дзеля... паперкі. Каб людзі лішніх пытанняў не задавалі. Каб усе кавалеры адчапіліся. Без права прапіскі, пражывання і спадчыны. Выдаткі бяру на сябе». Такі варыянт падыдзе і для хлопцаў, якія ад арміі «адкасіць» хочуць. Адным стрэлам двух зайцаў, што называецца.

Шукаюць несапраўдных жонак і мужоў, каб атрымаць ільготны крэдыт на жыллё ці візу. Апошнім часам набіраюць папулярнасць «лавандавыя шлюбы». Іх рэгіструюць для прыкрыцця гомасексуальнай арыентацыі. У такіх выпадках часцяком выстаўляюць патрабаванні кшталту «Патрэбна дзяўчына мадэльнай знешнасці, якая ўмее трымаць язык за зубамі. Вышэйшая адукацыя, веданне моў вітаюцца». За такія «паслугі» абяцаюць заплаціць значна больш, чым за шлюб дзеля прапіскі і размеркавання.

Хтосьці з дапамогай фіктыўных шлюбаў спрабуе ажыццявіць амаль што «планы Напалеона». «Хачу ажаніцца з літоўкай, каб у краіну-суседку ездзіць як дадому, а ў Беларусі «рассякаць» на BMW X5 з літоўскімі нумарамі (мара з дзяцінства). Патрэбную жанчыну (ва ўзросце) ужо знайшоў. Адкажыце: якія падводныя камяні ва ўсёй гэтай схеме могуць быць?» Зразумела, што адказваюць хлопцу такія ж «знаўцы справы», як і ён сам.

* * *

Учора патэлефанавала матуля. «Я тут успомніла, што нашы цётка Зіна і дзядзька Анатоль распісаліся... амаль што дзеля прапіскі. Пашкадавала яна яго 25 гадоў таму... Праз месяц сярэбранае вяселле святкаваць будуць. Відаць, добрыя мэты нават і ў такіх справах заахвочваюцца. Хто ведае, можа, праз год і Інка на сапраўднае вяселле пакліча».

**Сафія ГРОМАВА.**

■ З канверта

## ГУЛЬНЯ, НЕ ВАРТАЯ СВЕЧАК

«...Я таксама з тых, каго называюць разлучніцамі. Пяць гадоў таму адбіла чужога мужа, двое дзяцей засталіся без бацькі, жонка трапіла ў бальніцу з гіпертанічным крызам... Я не настойвала на шлюбе, ён сам сказаў: «Калі я застануся з імі, шчаслівым не будзе ніхто».

Мінуў час, страсці ўляглiся. У нас нарадзілася дачка. Пачаліся звычайныя праблемы: кватэра, праца, грошы... Ён падтрымлівае кантакты з дзецьмі ад першага шлюбу, часам тэлефануе былой жонцы: то пра здароўе спытае, то сваякам прывітанне перадасць, то дапамогу прапануе... Знешне я на гэта рэагую спакойна, хоць унутры ўсё закіпае. Ды і ён часта зрывае на мне свой дрэнны настрой або проста са мной не размаўляе... І я ўсё часцей думаю: а навошта мы «заварылі» ўсё гэта? Каханне не можа доўжыцца вечна, і рана ці позна даводзіцца канстатаваць — ты яму не патрэбна або патрэбна не так, як раней. І дзеля гэтага я некалі пайшла на злачынства — разбурыла чужую сям'ю?..

**Віка,** *г. Гомель».*

## НАСТОЛЬКІ РОЗНЫЯ, ШТО...

«Ён любіць зіму, я — лета. Ён апранаецца пераважна ў аднатоннае, цёмнае, чорнае, я — у яркае, шматколернае, сонечнае... Ён меланхалічны і задуменны, я смяшлівая і імпульсіўная. Калі ён адказвае «так», я кажу «не». Калі ён аддае перавагу цяжкаму року, я ўздымаю настрой пад Рыкі Марціна. Ён бывае страшэнным занудам, ну а я — надакучлівай балбатухай...

Ужо тры гады мы разам і... разыходзіцца не збіраемся. У мяне душа не на месцы, калі я доўга не бачу яго задуменную фізіяномію. А ён тэлефануе мне некалькі разоў на дзень, каб спытаць, з чаго я зараз рагачу... Мы такія розныя, што проста створаны адно для аднаго. Мы можам не бачыцца некалькі дзён, а здараецца, не можам расстацца і на хвіліну. Ён ніколі не казаў мне «кахаю», а я ніколі не абяцала, што буду з ім заўсёды. Навошта словы, калі і так усё зразумела?

**Настасся,** *г. Жодзіна».*